# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

N 1 (1)

СТУДЗЕНЬ—ЛЮТЫ—САКАВІК 1993

НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

Выдаецца 1 раз у тры месяцы

Заснавальнікі:
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь,
Інстытут гісторыі Акадэміі навук Беларусі,
Беларускі дзяржаўны універсітэт,
Таварыства "Веды" Рэспублікі Беларусь



Галоўны рэдактар
Васіль Кушнер

Рэдакцыйная калегія:

Сымон Барыс (рэдактар аддзела),
Міхась Біч,
Аркадзь Бялькевіч,
Яніна Важнік (адказны сакратар),
Анатоль Грыцкевіч,
Мікола Ермаловіч,
Вікенцій Іванчык,
Міхась Касцюк,
Уладзімір Кошалеў,
Леанід Ляўчук,
Аляксандр Міхальчанка,
Віталь Скалабан,
Мікола Сташкевіч,
Васіль Стражаў,
Сяргей Таляронак (рэдактар аддзела),
Алег Трусаў,
Пётр Шупляк,
Язэп Юхо.

Рэдакцыйная рада:

Віктар Акуневіч,
Іван Багдановіч,
Алесь Белакоз,
Віктар Гайсёнак,
Надзея Ганушчанка,
Леанід Дзікцяроў,
Іван Загрышаў,
Фёдар Капуцкі,
Барыс Капыскі,
Вячаслаў Капыцін,
Андрэй Каракін,
Уладзімір Кароткі,
Генадзь Каханоўскі,
Барыс Клейн (ЗША),
Пётр Краўчанка,
Іван Крэнь,
Уладзімір Ладысеў,
Рыгор Лазько,
Аляксандр Лакотка,


ЗМЕСТ


Шушкевіч Станіслаў. Прывітанне рэдакцыі часопіса. . . . . . . . . . . . . . . . 3

Кушнер Васіль. Слова ад рэдакцыі. . . 4

Слова заснавальнікам. . . . . . . . . . . . 7

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Біч Міхась. Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. . . . . . . . . . . . . 15

Штыхаў Георгій. Вытокі беларускай дзяржаўнасці. . . . . . . . . . . . . . . . 25

Тарасаў Сяргей. Прылучэнне да хрысціянства. . . . . . . . . . . . . . . . 34

Трусаў Алег. Бельчыцкі манастыр. . . . 43

Кулагін Анатоль. Храмы на Дзвіне . . . 51

Філатава Алена. Полацак 1818 г. Па матэрыялах часопіса "Miesiecznik polocki". 59

Багдановіч Іван. Да ўвагі настаўніка. . . 61

Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка. Прадмова і публікацыя В. Скалабана. . . . . . . . . . . . . . . . 62


Рэпазіторый БГПУ

# Да ўвагі настаўніка

У раздзеле "Гісторыя Беларусі" змешчаны цэлы шэраг артыкулаў, якія зацікавяць выкладчыкаў гісторыі і могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні адпаведных тэм курсу гісторыі Беларусі. Большасць артыкулаў прысвечана гісторыі Полаччыны. Гэта невыпадкова, бо Полацк, як гэта пераканаўча паказана ў артыкуле Г. Штыхава "Вытокі беларускай дзяржаўнасці", стаў цэнтрам аб'яднання насельніцтва тых тэрыторый, якія потым склалі беларускія этнічныя землі. На фактах з палітычнай гісторыі Полацкага княства аўтар робіць выснову, што яно (толькі на кароткі тэрмін трапіўшы пад уладу кіеўскіх князёў) вяло самастойную палітыку, выступаючы ў якасці цэнтра, вакол якога ядналіся землі Заходняй Русі. Вывучаючы ў школе гісторыю Беларусі IX—XIII стст., настаўнік можа выкарыстаць на ўроку фактычны матэрыял і высновы, прыведзеныя ў гэтым артыкуле.

Павінен выклікаць цікавасць у настаўнікаў артыкул С. Тарасава "Прылучэнне да хрысціянства". У ім аўтар разглядае заканамернасць хрысціянізацыі Полацкай зямлі і асаблівасць яе ажыццяўлення ў параўнанні з Кіеўскім і Наўгародскім княствамі. Ён прыходзіць да думкі, што паступовасць прыняцця хрысціянства на беларускіх землях тлумачыцца: па-першае, тым, што полацкія князі ажыццяўлялі самастойную палітыку; па-другое, тым, што хрысціянства ішло пад уплывам місіянерства як з Усходу, так і з Захаду. Звесткі з гэтага артыкула дапамогуць настаўніку растлумачыць вучням паступовы і непрымусовы характар хрысціянізацыі на беларускіх землях, суіснаванне на нашай тэрыторыі розных рэлігій, адгэтуль і верацярпімасць, якая стала адной з важных рыс нацыянальнага характару беларусаў.

У артыкулах А. Кулагіна "Храмы на Дзвіне" і А. Трусава "Бельчыцкі манастыр" даецца кароткая гісторыя архітэктурных помнікаў Полаччыны. Іх падрабязнае апісанне і змешчаныя ў часопісе ілюстрацыі спатрэбяцца на ўроках гісторыі пры вывучэнні архітэктуры Беларусі ў XI—XIX стст.

Факты, якія прыведзены ў артыкуле А. Філатавай "Полацак 1818 г.", могуць быць выкарыстаны як матэрыял для ілюстрацый: у першым выпадку — пры характарыстыцы палітыкі царызму ў галіне адукацыі на Беларусі, а ў другім — для паказу складу насельніцтва, заняткаў і асаблівасцей жыхароў беларускіх гарадоў на пачатку XIX ст. Яны спатрэбяцца і на занятках гістарычнага гуртка.

Іван БАГДАНОВІЧ,
загадчык кафедры
дапаможных гістарычных дысцыплін
і методыкі выкладання гісторыі
Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута
імя А. М. Горкага,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт.

Репозиторий БГПУ